Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар УА "БДУКМ"
______________Ю.П. Бондар
"_____"________ 2014 г.

Рэгістрацыйны № ВД-______/вуч

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# РЭЖЫСУРА КАНЦЭРТНЫХ ПРАГРАМ

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
1–17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках)

Мінск
БДУКМ
2015 г.

СКЛАДАЛЬНІК:

*А.Д. Вавілаў,* старшы выкладчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят

РЭЦЕНЗЕНТЫ:

*М.М.Андросаў*, заслужаны дзеяч мастацтваў Расійскай Федэрацыі, мастацкі кіраўнік ансамбля «Русские сезоны», рэжысёр-пастаноўшчык, харэограф

*П.А.Гуд,* прафесар кафедры рэжысуры абрадаў і свят, кандыдат гістарычных навук, прафесар, рэжысер-пастаноўшчык.

*Н.В.Осіпава,* галоўны рэжысёр канцэртных залаў Установы “Беларуская дзяржаўная ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармонія”, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь.

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

кафедрай рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пр. № 8 ад 30.09.2014 г.);

прэзідыумам Навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № ад __. __. 2013г.);

Адказны за рэдакцыю:

Адказны за выпуск: А.Д. Вавілаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна “Рэжысура канцэртных праграм” з’яўляецца дадатковай (па выбары) пры падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне святочнай культуры. Вывучэнне канцэртных тэхналогій, відаў і жанраў канцэртных праграм, узаемадзеянне традыцый і навацый у культурных праектах з’яўляюцца актуальнымі і сацыяльна значнымі.

Працэс вывучэння методыкі творчага і арганізацыйна-падрыхтоўчых перыядаў стварэння тэатралізаваных канцэртных праграм вядзецца ў сувязі з такімі дысцыплінамі, як “Гісторыя свят”, “Рэжысура свят”, “Мастацка-дэкаратыўнае вырашэнне свята”, “Музычна-шумавое вырашэнне свята, “Пластычная культура”, “Моўнае дзеянне ў свяце”. Назапашаныя веды па пералічаных спецыяльных дысцыплінах будуць садзейнічаць комплекснаму засваенню вучэбнага матэрыялу.

Мэта вучэбнай дысцыпліны “Рэжысура канцэртных праграм” – вывучэнне канцэртнай дзейнасці ў Беларусі, яе спецыфічных рыс і адметных асаблівасцей, раскрыццё шляхоў удасканалення сучасных канцэртных праграм на аснове культурна-гістарычнай пераемнасці.

*Задачы*:

– знаёмства з музычна-тэатральнай культурай Беларусі, яе жанравай разнастайнасцю і тэндэнцыямі развіцця;

– вызначэнне шляхоў павышэння выхаваўчага патэнцыялу святочных канцэртных праграм;

– фарміраванне высокага мастацкага густу і мастацкай свядомасці будучага спецыяліста – рэжысёра (свят, канцэртных праграм, відовішч, фестываляў, конкурсаў, прэзентацый);

У выніку азнаямлення з дысцыплінай у поўным аб’ёме, згодна яе тэарэтыка-практычнай накіраванасці, студэнт павінен

*ведаць:*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– змест і ідэйна-тэматычную накіраванасць канцэртных праграм у адпаведнасці са святочным каляндаром Рэспублікі Беларусь;

– гісторыю беларускай канцэртнай культуры, народнай і прафесіянальнай песенна-паэтычнай творчасці, харэаграфічнага мастацтва;

– прынцыпы арганізацыі і правядзення канцэртных праграм, сімвалічна-вобразнае вырашэнне сцэнічнай прасторы;

– трансфармацыю традыцыйных падыходаў да стварэння канцэртных праграм падчас правядзення дзяржаўных, карпаратыўных, прафесійных, канфесійных, дзіцячых і маладзёжных канцэртных праграм на сучасным этапе;

*умець:*

– вызначаць узровень, мастацкую вартасць канцэртных праграм, адпавядаючых дасягненням сучаснай святочнай культуры;

– вылучаць агульнацыянальныя, рэгіянальныя і лакальныя асаблівасці свят і канцэртных праграм;

– аналізаваць выкарыстанне сцэнарыстамі і рэжысёрамі ў канцэртных праграмах традыцыйных і навацыйных форм;

– ініцыіраваць стварэнне новых музычных, вакальных, харэаграфічных, пластычных, арыгінальных нумараў для асэнсаванага выкарыстання іх ў канцэртных праграмах;

*валодаць:*

– практычнымі навыкамі рэжысуры, спосабамі выкарыстання разнастайных выразных сродкаў пры пастаноўцы праграм канцэртнай творчасці;

– прыёмамі творчага мантажу разнастайных нумароў у цэласную канцэртную праграму;

– сучаснымі тэхналогіямі, якія выкарыстоўваюцца ў пастановачнай дзейнасці канцэртаў (стэрэагучанне, дынамічнае асвятленне, камп'ютарная графіка, відэа-тэлевізійныя сістэмы, мастацкая піратэхніка і г. д.);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод актыўных тэхналогій работы са студэнтамі неабходна вылучыць:

– дыскусійныя метады (групавая дыскусія, мэдаліраванне практычных сітуацый, метад трэнінга – перадачы групе канцэртнай інфармацыі, заснаванай на рэальных канцэртных праграмах з далейшым абмеркаваннем апошняй, а таксама ўзнікаючых праблем, пытанняў і рэкамендацый і інш.);

– “генерацыя ідэй” (імітацыйныя, дзелавыя, ролевыя гульні-практыкі і інш.);

– візуальныя метады (метады ілюстрацыі дэманстрацыі, відэаметад).

На вывучэнне дысцыпліны усяго адведзена 28 аўдыторных гадзін, з якіх: 4 гадзіны – лекцыі, 18 гадзін – практычныя заняткі, 6 гадзін – лабараторныя заняткі.

Выніковай формай кантролю ведаў студэнтаў з’яўляецца залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Аўдыторныя заняткі | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Усяго гадзін | Лекцый | Практ. | Лабар. |
| **1** | 2 | 3 | 4 | 5 |
| *Тэма 1*. Канцэрт як від відовішчанага мастацтва | 2 | 2 | - | - |
| *Тэма 2*. Тыпы канцэртных праграм | 2 | 2 | - | - |
| *Тэма 3*. Мастацкі нумар – аснова канцэрта | 2 | - | 2 | - |
| *Тэма 4*. Прынцыпы складання канцэртнай праграмы | 2 | - | 2 | - |
| *Тэма 5*. Канцэрт – прастора мантажу | 2 | - | 2 | - |
| *Тэма 6*. Рэжысура канцэртнай праграмы | 4 | - | 2 | 2 |
| *Тэма 7*. Выразныя сродкі рэжысуры канцэрта | 2 | - | 2 | - |
| *Тэма 8*. Тэатралізаваны канцэрт і асаблівасці рэпетыцыйнага перыяду | 4 | - | 2 | 2 |
| *Тэма 9*. Спосабы вядзення канцэртнай праграмы | 2 | - | 2 | - |
| *Тэма 10*. Віды, жанры канцэртнай творчасці | 4 | - | 2 | 2 |
| *Тэма 11*. Работа з пастановачнай групай і тэхнічнымі службамі | 2 | - | 2 | - |
| Разам | **28** | **4** | **18** | **6** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

**Тэма 1. Канцэрт як від відовішчнага мастацтва.**

Гісторыя ўзнікнення канцэртнай творчасці. Этымалагічная першакрыніца тэрміна “канцэрт” і яго развіццё. Першыя сцэнічныя пляцоўкі і тэрыторыі для правядзення канцэртаў. Разнавіднасці першых канцэртных нумароў. Праблематыка сучаснай канцэртнай дзейнасці. Тыпы арганізацый, якія займаюцца канцэртамі.

**Тэма 2. Мастацкі нумар – аснова канцэрта**

Драматургія нумара. Сцэнічная культура выканаўцы. Дапаможныя выразныя сродкі (касцюм, грым, пластыка). Лёгкасць, адкрытасць, шчырасць пачуццяў, лаканізм, святочнасць канцэртнага нумара.

**Тэма 3. Тыпы канцэртных праграм і прынцыпы іх складання.**

Зборны, дзіцячы, сольны і справаздачны канцэрты. Монаспектакль. Камерны канцэрт. Тэматычны, эстрадны, сімфанічны, гала-канцэрт і шоу. Канцэрт на стадыёне. Тэатралізаваны канцэрт. Відавая і жанравая разнастайнасць. Тэматычнае спалучэнне. Дакладанасць пераходу ад аднаго нумара да наступнага. Асаблівае значэнне пачатковых і фінальных нумароў. Улік тэхнічнага абсталявання выступленняў (інструменты, станкі і падстаўкі, цыркавое і спартыўнае абсталяванне). Асноўныя (гендарныя, тэмпа-рытмічныя) заканамернасці складання канцэртных праграм.

**Тэма 4. Канцэрт – прастора мантажу.**

Мантаж – асноўны спосаб арганізацыі канэртнай дзеі. Часовыя і прасторавыя віды мантажу. Асноўныя сэнсавыя пары (выканаўца – мастацкі вобраз нумара; фон – мастацкі вобраз нумара). Паслядоўны, паралельны, асацыятыўны мантаж у канцэрце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 5. Рэжысура канцэртнай праграмы

Прагляд і адбор нумароў. Ініцыяцыя іх стварэння ў выпадку неабходнасці альбо мастацкай патрэбнасці. Рэжысура нумара і работа з кіраўнікамі мастацкіх калектываў. Аб’яднанне нумараў у мастацка-сэнсавыя блокі. Блокавая арганізацыя канцэртнага відовішча. Арганізацыя бесперапыннай канцэртнай дзеі (суперзанавес, светлавы занавес, дадатковыя пляцоўкі, выкарыстанне валанцёраў-машыністаў сцэны). Уваход на сцэну і выхад з яе масавых калектываў. Асаблівасці рэпетыцыйнай працы. Завочны рэжысёрскі рэпетыцыйны працэс. Інтэрактыўная рэжысура нумароў. З’ява «самарэжысуры» і «хатняй рэжысуры» у канцэртнай творчасці.

## Тэма 6. Выразныя сродкі рэжысуры і асабліасці тэатралізаванага канцэрта

Відэсюжэты і відэаінсталяцыя (работа з экранамі і маніторамі). Харэаграфічныя, цыркавыя і пластычныя фонавыя групы. Асвятляльныя і лазерныя эфекты. 3D-мапінг. Музычныя паўзы. Сцэнаграфічнае рашэнне канцэрта. Работа рэжысёра з мастаком. Сюжэтны ход, ролевая персаніфікацыя, сцэнаграфія, відэасюжеты, касцюміраванне – асноўныя спосабы тэатралізацыі. Мастацка-сэнсавыя блокі. Тэатралізаваныя пралогі і фіналы. Саўндтрэк. Манціровачныя рэпетыцыі. Зводныя рэпетыцыі, прагонныя рэпетыцыі. Вядучы (вядучыя) канцэрта і яго функцыі. Канферанс і канферансье. Разнастайнасці канферансу. Голас «па-за кадром». «Non-стоп».

## Тэма 7. Віды, жанры канцэртнай творчасці

Размоўныя жанры канцэрта: канферанс, фельетон, маналог, інтэрмедыя, мініяцюра, скетч, рэпрыза, куплеты, прыпеўкі і г.д. Музычныя жанры канцэрта: вакальны (песня, раманс, балада і да т.п.), інструментальны (аркестравыя нумары, інструментальныя мініяцюры), харэаграфічны род канцэртнай творчасці (танец, пантаміма), арыгінальны ці спартыўна-цыркавы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

род канцэртнай творчасці (жангліраванне, акрабатыка, гімнастыка, фокусы, дрэсура і г.д.)

**Тэма 8. Работа з пастановачнай групай і тэхнічнымі службамі**

Функцыі пастановачнай групы (перастаноўкі, вывад калектываў, абслугоўванне цырымоній).

Агучванне сцэны (мікрафоны шнуравыя, радыёмікрафоны, мікрафоны на стойках, мабільныя гарнітуры, падвесныя мікрафоны).

Распрацоўка палітры і камп’ютарнай праграмы сцэнічнага асвятлення. Рэжысёрскія нататкі для тэхнічных служб (гукааператары, светлатэхнікі, аператары праекцыйнай апаратуры, машынерыя сцэны, грымёры і г.д.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


1. *Богданов, И.А.* Постановка эстрадного номера /И. А. Богданов.– СПбАТМ., 2005.
2. *Глан, Б.Н.* Праздник всегда с нами / Б.Н. Глан: – М.:Союз театральных деятелей, 1988.
3. *Гуд, П.А.* Тэхналогія стварэння свята / П.А. Гуд. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008.
4. *Дуков, Е. В.* Концерт в истории западноевропейской культуры /Е. В. Дуков. – М., 2003.
5. *Клитин, С. С.* Эстрада. Проблемы теории, истории и методики /С. С. Клитин. – Л.: Искусство, 1987.
6. *Лурье, А. С.* Жанры и виды концертов: взаимосвязь творчества, экономики и организации / А. С. Лурье // Театр между прошлым и будущим: сб. науч. тр. – М.: ГИТИС, 1989.
7. *Маршак, М.* Клубный сценарий / М. Маршак. - М.: Профиздат, 1975.
8. *Петров, Б. Н.* Массовые спортивно-художественные представления. Основы режиссуры, технологии, организации и методики / Б. Н. Петров. – М., 2001.
9. *Режиссура* массовых зрелищ: сборник статей. Ред. Б. Глан. – М.: Всерос. театр. общ-во, 1963.
10. *Рубб, А. А.* Феномен эстрадной режиссуры (опыт, исследования)/А. А. Рубб. – М., 2001.
11. *Туманов, И. М.* Режиссура массовых праздников и театрализованного концерта / И. М. Туманов. – М., 1981.
12. *Туманов, И.М.* Режиссура массового праздника и театрализованного представления / И.М.Туманов. – Л.: Искусство, 1974.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

13. *Черняк, Ю.М.* Театрализованное представление в массовом празднике-юбилее города / Ю.М. Черняк. – Мн.: МИК, 1989.

14. *Черняк, Ю.М.* Режиссура праздников и зрелищ / Ю.М. Черняк. – Мн.: Тетра Системс, 2004.

15. *Чечетин, А.И.* Искусство театрализованных представлений /А.И. Чечетин. – М.: Сов. Россия, 1988.

16. *Шароев, И. Г.* Многоликая эстрада. – М., 1995.

17. *Шароев, И. Г.* Режиссура эстрады и массовых представлений / И. Г. Шароев. – М., 1992.

18. *Шубина, И.Б.* Драматургия и режиссура зрелища. Игра, сопровождающая жизнь / И.Б. Шубина. – Ростов-на-Дону.: Феникс, 2006.

*Дадатковая*

1. *Пригожин, И. И.* Политика – вершина шоу-бизнеса / И. И. Пригожин. – М.: ООО «Алкигамма», 2001.

2. *Шереметьевская, Н. Е.* Танец на эстраде / Н. Е. Шереметьевская. – М.: Искусство, 1977.

3. *Генкин, Д.М.* Сценарное мастерство культпросветработника / Д.М. Генкин, А.А. Конович. – М.: Сов. Россия, 1984.

4. *Мицкевич, Н.А.* Создание концертного номера на основе гротесковых форм: Метод. указания для студентов специализации “режиссура массовых праздников” / Н.А. Мицкевич – Мн.: Мінскі інтытут культуры,1989.

5. *Шароев, И.Г.* Многоликая эстрада / И.Г. Шароев. – М. Вагриус, 1995.

6. *Шубина, И.Б.* Организация досуга и шоу-программ / И.Б. Шубина. – Ростов-на Дону: Феникс, 2003.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метадычныя рэкамендацыі
## па арганізацыі і выкананню самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў накіравана на засваенне тэрміналогіі, падбор і вывучэнне матэрыялаў да тэм дысцыпліны на аснове дакуметальных крыніц, рэкамендаваных для азнаямлення і вывучэння. Самастойная работа студэнтаў скіравана на вывучэнне спецыфікі (тэатралізаваных) канцэртных праграм айчыннымі і замежнымі майстрамі мастацтваў, жанравай і каляндарна-святочнай класіфікацыі, зместу праграм, а таксама на засваенне навыкаў аналізу вобразнасці, праблем і перспектыў развіцця новых форм канцэртных праграм.

Для больш глыбокага засваення матэрыялу, апроч аўдыторных заняткаў, у якасці самастойнай работы прадугледжваецца наведванне студэнтамі рэпетыцый канцэртных праграм, ствараемых вядучымі спецыялістамі краіны, прагляд і аналіз відэаматэрыялаў выступленняў мастацкіх калектываў, фестываляў мастацтваў, сучасных канцэртных праграм айчынных і замежных тэлекампаній.

Кантроль за самастойнай работай студэнтаў здзяйсняецца ў выглядзе падрыхтоўкі даклада па абранай студэнтам тэме, субяседвання, удзел у лабараторных занятках, круглых сталах.

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі

Для кантролю і самакантролю ведаў студэнтаў выкарыстоўваецца дыягнастычны інструментарый, які мае рознаўзроўневы характар і выкарыстоўваецца комплексна.

1. Падрыхтоўка на залік у пісьмовым выглядзе даклада аб аналізе абранай студэнтам пэўнай канцэртнай праграмы.
2. Вуснае апытанне студэнтаў на практычных занятках.
3. Падрыхтоўка дадатковай інфармацыі аб пэўнай канцэртнай праграме, творчай самастойнай распрацоўкі абранай канцэртнай праграмы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Прагляд відэаматэрыялаў асноўных і спадарожных канцэртных праграм Міжнароднага фестывалю мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску” з наступным агульным абмеркаваннем аб новых формах святочнай культуры на семінарскіх занятках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ